2. Большой психологический словарь / [Электронный ресурс] / сост. и общ. ред.: Б. Г. Мещеряков, В. П. Зинченко // Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Psihol/dict/12.php. – Дата доступа: 17.02.2018
3. Давидовская, Г. Э. Формирование наглядно-образных представлений учащихся об исторических событиях при их визуализации / Г. Э. Давидовская // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2015. – № 3. – С. 40 – 45.
4. Давидовская, Г. Э. Использование возможностей образного образования при обучении истории // Г. Э. Давидовская. – Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. научн. ст. В 2 ч. Ч. 2. Вып. 16. – Минск: РИВШ, 2016. – С. 321 – 326.
5. Дубовицкая, Д.А. Значение процесса виртуализации в современном пространстве культуры / [Электронный ресурс] / Д.А. Дубовицкая // Культура и мировоззрение. – 2012. – № 11. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/v/znachenie-protsessa-virtualizatsii-v-sovremennom-prostranstve-kultury. – Дата доступа: 14.02.2018.
6. Иоффе, А. Н. Визуализация в истории и обществознании – способы и подходы / А. Н. Иоффе // Преподавание истории в школе. – 2012. – № 10. – С. 3 – 6.
7. Короткова, М. В. Новый образ методики преподавания истории в условиях информационных и визуальных вызовов XXI в. / М. В. Короткова // Преподавание истории в школе. – 2018. – № 1. – С. 9 – 12.
8. Нуркова, В. В. История как личный опыт / [Электронный ресурс] / В. В. Нуркова. 2009. – Режим доступа: http://cyberleninka.ru/article/n/istoriya-kak-lichnyy-opyt. - Дата доступа: 15.01.2018.

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРНЭТ-СЭРВІСАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ПЫТАННЯЎ КУЛЬТУРЫ НА ЎРОКАХ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

С.А. Кудраўцава (Мінск, Беларусь)

Спецыфіка вучэбнага прадмета “Гісторыя Беларусі” патрабуе ад вучняў умення працаваць з інфармацыяй і рознага роду крыніцамі і дакументамі. Гісторыя утрымлівае вялікую колькасць дат, фактаў, персаналій, паняццяў. Аднак у сучасным свеце паступова адпадае неабходнасць перагружаць памяць, таму што існуюць тэхнічныя сховішчы інфармацыі (камп’ютарныя базы дадзеных, Інтэрнэт). Таму вельмі важна навучыць вучняў імі карыстацца.

З’яўленне зручных і бясплатных сацыяльных інтэрнэт-сэрвісаў і, з другога боку, прыкметна падросшы ўзровень ІКТ-граматнасці настаўнікаў, дазваляюць усё шырэй выкарыстоўваць Інтэрнэт як асяроддзе для ўзаемадзеяння і прадуктыўнага супрацоўніцтва.

Сучасныя сеткавыя сэрвісы адкрываюць перад удзельнікамі адукацыйнага працэса магчымасць ствараць навучальныя сітуацыі, у якіх вучні могуць асвойваць і адпрацоўваць кампетэнцыі, неабходныя вучню XXI стагоддзя:

- *інфармацыйная граматнасць* – уменне шукаць інфармацыю, параўноўваць розныя крыніцы, распазнаваць патрэбную інфармацыю;
- *медыйная граматнасць* – здольнасць распазнаваць і выкарыстоўваць розныя тыпы медыярэсурсаў;
- *граматнасць у сферы ІКТ (інфармацыйы*-камуніктыўных тэхналогій);
- *арганізацыйная пісьменнасць* – здольнасць планаваць свой час і час сваёй групы; разуменне узаемасувязяў, якія існуюць паміж людзьмі, групамі, арганізацыямі;
- *камунікатыўная граматнасць і супрацоўніцтва* – навыкі эфектыўных зносін і супрацоўніцтва;
- *прадуктыўная граматнасць* – здольнасць да стварэння якасных прадуктаў, выкарыстання адэкватных сродкаў, планаванне (навыкі для жжыцця і кар’еры) [1].

Пры гэтым настаўнікі і вучні не проста знаёмяцца з прынятымі ў грамадстве формамі дзейнасці – яны трапляюць у багатае інфармацыйнае асяроддзе, дзе могуць прыняць практычны ўдзел у калектыўнай дзейнасці. Праз пастаянную практыку і паўтарэнне аднатыпных дробных дзеянняў у настаўнікаў і вучняў фарміруецца новы стыль паводзінаў, разважання і супрацоўніцтва.

Сучасныя вучні жывуць у свеце Інтэрнэту, сацыяльных сетак, блогаў, лічбавага аўдыё і відэакантэнту, што дае ім магчымасць з аднаго боку мець неабмежаваны доступ да сусветных вучэбных рэсурсаў, а з другога – дазваляе падтрымліваць камунікацыю з настаўнікам і аднакласнікамі ў любы час, у любым месцы.

Інтэрнэт-рэсурсы дазваляюць забяспечваць адукацыйны працэс:паўрочнымі навучальнымі і вучэбна-метадычнымі матэрыяламі, зваротнай сувяззю паміж настаўнікамі і вучнямі, магчымасцю зносін удзельнікаў адукацыйнага працэсу паміж сабой, доступам да айчынных і замежных інфармацыйных і даведкавых сістэм, доступам да электронных бібліятэк, доступам да інфармацыйных рэсурсаў вядучых айчынных і замежных электронных газет і часопісаў і г.д.

Па выніках розных даследаванняў, якія праводзяцца «Фондам развіцця інтэрнэт» , дзеці пачынаюць актыўна карыстацца рэсурсамі глабальнай сеткі ў 9-11 гадоў [2, с. 28].Няма нічога складанага ў тым, каб адшукаць неабходную інфармацыю з дапамогай пошукавай сістэмы, але вучням складана ацаніць інфармацыю з пункту гледжання дакладнасці, актуальнасці, карысці, дакладнасці і паўнаты. У вучэбных праграмах навучанне пошуку інфармацыі ўключана ў вучэбны прадмет «Інфарматыка» ў 6 класе, калі настаўнік інфарматыкі вымушаны карэктаваць стыхійна сфармаваныя навыкі пошуку інфармацыі ў

Рэпазіторый ВДУ

сеціве. Другая праблема выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў вучнямі – багацце сайтаў, якія змяшчаюць сумнеўную рэкламу, шкодныя праграмы і іншы сумнеўны кантэнт.

У сувязі з гэтым, адной з задач настаўнікаў пры арганізацыі ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці вучня, звязанай з выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў, з'яўляецца арганізацыя бяспечнай і эфектыўнай самастойнай работы школьніка ў сеціве.

Адным з базавых уменняў пры працы ў сеціве з’яўляецца ўменне карыстацца пошукавымі сістэмамі. Вучні павінны ведаць спіс асноўных пошукавых сервераў беларускага сегмента сусветнага сеціва і асноўныя, найбольш папулярныя замежныя.

Вучэбны занятак – дастаткова невялікі прамежак часу, на працягу якога вучні выконваюць мноства відаў работ. Таму, каб не марнаваць каштоўныя хвіліны урока, неабходна ўзброіцца ўменнямі і навыкамі пошуку інфармацыі ў сеціве. Інфарматыка ў сучаснай школе дае дастаткова ведаў па гэтым пытанні. Таму на некаторых занятках з ужываннем рэсурсаў Інтэрнэт настаўнік гісторыі можа не спыняццана навыках пошуку, а даваць заданне, разлічваючы, што інфармацыя будзе знойдзеная на працягу ўрока.

У цяперашні час хутка развіваецца такі напрамак тэорыі навучання, як педагогіка сеткавых супольнасцяў. Яна грунтуецца на наступных ключавых палажэннях:

- навучанне вызначаецца інструментамі і аб'ектамі, якімі карыстаецца вучань;
- навучанне вызначаецца асяроддзем, у якім адбываецца засваенне новых ведаў;
- навучанне адбываецца ў супольнасці абмену ведамі;
- навучанне адбываецца праз пабудову сеткі[3, с. 7-8].

Педагогіка сеткавых супольнасцяў развіваецца ў цеснай сувязі з сеткай Інтэрнэт і напрамую залежыць ад сучаснай канцэпцыі развіцця павуціння, якая атрымала назву – вэб 2.0. Вэб 2.0 – гэта другое пакаленне сеткавых сэрвісаў, якія існуюць у Інтэрнэце і дазваляюць працаваць з рэсурсамі сумесна, абменьвацца кантэнтам, працаваць з масавымі публікацыямі. Сацыяльныя сэрвісы вэб 2.0 – гэта сучасныя сродкі, сеткавае праграмнае забеспячэнне, якое падтрымлівае групавыя ўзаемадзеянні:

- персанальныя дзеянні ўдзельнікаў і іх камунікацыю паміж сабой;
- запісы думак, нататкі і анатаваньня чужых тэкстаў (жывы часопіс, блог);
- размяшчэнне спасылак на Інтэрнэт-рэсурсы і іх рэйтынгаванне;
- размяшчэнне фотаздымкаў і альбомаў (Google фота, Яндекс Фоткі, FotoHosting, Flikr);
- відэасэрвісы (Youtube);
- геаінфармацыйныя сэрвісы (Google карты, Google Планета Зямля) і сэрвісы на іх аснове (TourBilder);
- абмен паведамленнямі (мэсэнджэры, Skype, Instagram).

У педагагічнай практыцы сацыяльныя сэрвісы могуць знайсці шырокае прымяненне пры арганізацыі інфармацыйнай падтрымкі для педагогаў па іх выкарыстанню. Напрыклад, блогі (інтэрнэт-дзённікі) дапамагаюць настаўнікам арганізаваць дыскусііарганізаваць дыстанцыйнае навучанне для вучняў, атрымацьвучням кансультацыі, а відэасэрвісы дазваляюць выкладваць для шырокага доступу відэаматэрыялы, падрыхтаваныя вучнямі і настаўнікамі па тэме, відэаролікі аб працы над праектам і інш. Што тычыцца калекцыі закладак Google, то яна дазваляе сістэматызаваць спасылкі, назапашаныя ў настаўніка ці вучня за час яго падарожжаў па сеціву. Калі на ўроку арганізуецца пошук інфармацыі, то мэтазгодна навучыць вучняў складаць анатаваныя каталогіў выглядзе тэкставай старонкі, спісу «Выбранае» ў браўзэры, ці ж рэйтынгаваць сістэмы спасылак на сэрвісах для захоўвання спасылак (Checkitlink, Timedesk, Evernote, Symbaloo).

Заданне на пошук пэўнай інфармацыі (статыстычных дадзеных, дакументаў, ілюстрацый, фактаў і т. д.) на ўроку гісторыі Беларусі і падчас выканання дамашняга задання можа выглядаць наступным чынам:

1) З дапамогай любой вядомай вам пошукавай сістэмы падбярыце інфармацыйныя рэсурсы па тэме «Культура Беларусі канца XIV–XV стст.» і адкажыце на пытанні: Які з сайтаў найбольш інфарматыўны? Якія дакументы і матэрыялы ён утрымлівае? Якія сайты ўтрымліваюць інфармацыю аб архітэктуры, якія аб мастацтве, якія аб літаратуры? Што вы ведаеце пра людзей, якія маюць дачыненне да гэтых накірункаў культуры таго часу?

2) З дапамогай “пошуку па малюнку” падбярыце ілюстрацыі да апісання багоў, якіх ушаноўвалі старажытныя продкі беларусаў.

Развіццё інфармацыйных кампетэнцый падчас вывучэння пытанняў культуры можна ажыццяўляць праз стварэнне віртуальнай экскурсіі. Заданне па культуры Беларусі можа выглядаць наступным чынам: “Пры дапамозе вэб-сэрвісаў (Prezi, Googlesite, Blogger і інш.) стварыце віртуальную экспазіцыю краязнаўчага музея вашай мясцовасці, якая будзе адлюстроўваць гісторыю культуры Беларусі канца XIV-XV ст.”.

Для работы з відэаматэрыламі і ролікамі можна вылучыць сацыяльны сэрвіс YouTube. Гэта відэахостынг, які прадстаўляе карыстальнікам паслугі захоўвання, дастаўкі і трансляцыі відэа. Карыстальнікі могуць дадаваць, праглядаць, каментаваць і дзяліцца тымі ці іншымі відэазапісамі. YouTube дазваляе вылучыць пэўны матэрыял для вывучння і абмеркавання на вучэбных занятках па



Репозиторий ВГУ

гісторыі культуры Беларусі, бо сэрвіс утрымлівае відэаролікі і відэафільмы, створаныя тэлерадыёкампаніямі АНТ і CTV.

Пры дапамозе YouTubeнастаўнік можа весці работу з відэафрагментамі не толькі на ўроку. Так як відэа знаходзіцца ў вольным доступе, то вучні могуць атрымаць папярэдняе заданне: прагледзець неабходныя фрагменты дома і пракаментаваць іх. Іншы варыянт – падабраць да пэўнага эпізоду, мастацкага твору, відэафрагменты са спектакляў або фільмаў. Такім чынам, з'яўляецца магчымасць не толькі адыйсці ад традыцыйных дамашніх заданняў, а і зрабіць іх больш разнастайцнымі, надаць ім творчы даследчы характар, перамясціць акцэнт на самастойную працу вучняў[4, с. 42, 45-46]:

| **Назва відэафільма Спасылка** | **Прыкладныя заданні да фільма** |
|---|---|
| Факты жыцця беларускай асветніцы Еўфрасінні Полацкай Фільм CTV http://qoo.by/1dZz | Чаму Ефрасінню Полацкую першай асветніцай Беларусі? З якіх крыніц нам вядома пра жыццё Ефрасінні Полацкай? Якую інфармацыю паведамляюць нам гэтыя крыніцы? Апішыце дзейнасць Ефрасінні Полацкай. |
| Жыццё і дзейнасць беларускага «Златавуста» Кірылы Тураўскага http://qoo.by/1dZx | Складзіце карцінны план фільма. У якіх крыніцах захаваліся звесткі аб жыцці Кірылы Тураўскага? Да якіх твораў ён адносіцца? Якія звесткі пра Кірылу Тураўскага ён ўтрымлівае? Аб якіх творах Кірыла Тураўскга ідзе размова ў фільме? Што такое стоўпніцтва? Чаму Кірыла Тураўскага называюць стоўпнікам, златавустам? Чаму даследчыкі гавораць пра вялікую важнасць твораў Тураўскага для беларускай культуры? |
| Адваротны адлік. Торвальд Вандроўнік. Місія ў Полацку http://qoo.by/1dZB | Якая крыніца паведамляе аб існаванні на Полаччыне хрысціянскага манастыра ў канцы X ст.? Чаму гэта паведамленна з'яўлялася сенсацыяй? Якім чынам гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі" ўплываў на культуру? Апішыце скандынаўскія сагі. ЦІ можам мы давяраць правільнасці інфармацыі гэтага дакумента? Чаму? Якія дакументы падцвяржаюць існаванне на Полаччыне манастыра ў канцы X ст.? Чаму аб хрысциянстве палачане маглі ведаць пачынаючы з VI стагоддзя? Як можна ахарактарызаваць дзейнасць Торвальда ў дачыненні да беларускай культуры? |
| Адваротны адлік. Горад на Нямізе. У пошуках страчанага http://qoo.by/1dZC | Аб якіх летапісных крыніцах ідзе размова ў фільме? Якія падзеі з гісторыі Беларусі ў іх упамінаюцца? |

ВідэахостынгYouTube можа выкарыстоўвацца ў педагагічнай практыцы не толькі як крыніца навучальных матэрыялаў. Настаўнікі і вучні могуць стварыць свой канал у YouTube для захоўвання і трансляцыі уласных відэаматэрыялаў, створаных у працэсе навучання.

Заданні пры працы з відэаматэрыялам могуць выглядаць наступным чынам [4, с. 47]:

- выкарыстанне відэа з элементамі гульні (для гэтага неабходна знайсці відэа, прыдатнае да тэмы ўрока, якое мае забаўляльны характар або змяшчае дадатковую інфармацыю, якая выходзіць за рамкі вучэбнага дапаможніка);
- стварэнне тэматычных плэйлістоў разам з вучнямі (для гэтай работы неабходна прапанаваць вучням зрабіць падборку відэа па тэме ўрока, стварыць свой канал на YouTube настаўніку і дадаць у яго адабраныя ролікі, затым арганізаваць сумесны прагляд на ўроку, а вучні, абапіраючыся на відэа, дадуць свае каментары);
- агучванне відэароліка на ўроку і параўнанне з арыгіналам (гук можа быць выключаны);
- пакадравы прагляд, абмеркаванне або агучванне асобных кадраў;
- праслухоўванне толькі аудыярада і аднаўленне, рэканструкцыя візуальнага рада (калі візуальны рад выключаны);
- выкарыстанне так званага стоп-кадра для выбару і абмеркавання той ці іншай сцэны;
- прагляд фрагмента відэароліка і абмеркаванне пачатку, завяршэння сітуацыі, магчымых працягаў;

Репозиторий ВГУ

- стварэнне і размяшчэнне уласных відэаролікаў і іх абмеркаванне на ўроку, чытанне і абмеркаванне каментароў, складзеных іншымі гледачамі дадзенага відэароліка.

Такім чынам, становіцца зразумела, што інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі здольны стымуляваць пазнавальны цікавасць да гісторыі, надаць вучэбнай рабоце праблемны, творчы, даследчы характар, індывідуалізаваць працэс навучання і развіваць самастойную дзейнасць вучняў.

1. Framework for 21st century learning [Electronic resource]//P21Partnership for 21st Century Learning. –Mode of access: http://www.p21.org/about-us/p21-framework.– Date of access: 12.02.2018
2. Солдатова, Г.У.и др. Цифровая компетентность подростков и родителей. Результаты всероссийского исследования / Г.У.Солдатова, Т.А. Нестик, Е.И.Рассказова, Е.Ю.Зотова. – М. : Фонд Развития Интернет, 2013. – 144 с.
3. Патаракин, Е.Д. Социальные сервисы Веб 2.0 в помощь учителю/ Е.Д. Патаракин.– М.: Интуит.ру, 2007. – 64 с.
4. Кудраўцава. С.А. Вывучэнне пытанняў культуры на ўроках гісторыі Беларусі ў 6 класе / С.А. Кудраўцава. – Мінск: Выд.цэнтр БДУ, 2017. – 175 с.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИСТОРИЧЕСКОЙ ЖИВОПИСИ В ПРОЦЕССЕ ОБУЧЕНИЯ ИСТОРИИ

Н.В. Попкова (Саратов, Россия)

К числу важнейших задач образования и воспитания молодого поколения относятся формирование у него активной гражданской позиции, патриотизма и национальной идентичности, развитие духовных и нравственных качеств, приобщение к культурному наследию: художественному, литературному, музыкальному. В числе характеристик современного образования, таким образом, находится и его общекультурная направленность. Культурологический подход к организации учебного процесса заключается в организации изучения той или иной дисциплины в тесной взаимосвязи с достижениями мировой культуры, в признании приоритета культуры и культурных ценностей как отправной точки при изучении любой конкретной науки, в установке на единство научного знания и эмоционально-ценностных отношений.

Как представляется, первостепенное значение культурологический подход имеет при изучении предметов гуманитарного цикла, и прежде всего истории. Одним из компонентов культурологического подхода в обучении истории является совокупность методических средств и приемов, применяемых педагогом [2, с. 259].

Опыт преподавания общего курса истории на неисторических факультетах Саратовского государственного университета имени Н. Г. Чернышевского позволяет утверждать, что одним из таких методов является визуализация обучения, в частности, систематическое использование на занятиях произведений исторической живописи. Обобщение опыта работы в этом направлении и, одновременно, учебным обеспечением курса отечественной истории служит специальное учебное пособие [1, с. 22–157]. В разделе данной книги, посвященной историческим полотнам русских живописцев, рассматриваются 130 произведений исторической живописи и ряд скульптурных изображений, принадлежащих сорока авторам. Материал собран по разделам «Русь изначальная», «Воинская слава России», «К централизованному государству», «Быт допетровской Руси», «Рождение Российской империи», «Отечественная война 1812 года», «Крестьянский вопрос на Руси» и «Тысячелетие России».

Какие возможности открывает использование данного метода в преподавании курса отечественной истории? Первое, что следует отметить, это следующее: сопровождение учебных занятий по истории демонстрацией соответствующих произведений искусства способствует лучшему усвоению исторических знаний. К сожалению, исторические представления современного студента достаточно слабы и неопределенны.

Так, средний балл единого государственного экзамена по истории в Саратовской области составляет 48–52 [3, с. 18–19]. Заметим, что это результаты тех выпускников, которые специально и целенаправленно готовились к данной форме выпускной аттестации. Объем и качество знаний по истории у тех, кто не сдавал ЕГЭ, можно назвать удручающими, в чем и убеждаются преподаватели истории на неисторических факультетах.

Ф. А. Абрамов, известный писатель и публицист, писал: «Народ умирает, когда становится населением. А населением он становится тогда, когда забывает свою историю». Действительно, потенциал истории как учебного предмета необычайно высок: в числе целей ее изучения находятся формирование у молодежи гражданственности и патриотизма, толерантности и поликультурности, национальной идентичности, общественно-ценных нравственных и социальных установок. Безусловно, имеется непосредственная связь между уровнем исторических знаний и степенью сформированности вышеперечисленных качеств. Недостаточные знания, полученные молодыми людьми в школьные годы, следует обогатить и расширить в вузе. Особую значимость это положение имеет в отношении студентов педагогического направления подготовки, будущее профессиональное предназначение которых – воспитание подрастающего поколения.

Во-вторых, использование наглядности в учебном процессе необходимо с методической точки зрения. Описание (реконструкция) прошлого входит в структуру познавательной деятельности изучающего историю, являясь необходимой процедурой исторического познания. Историческая живопись является «на-

Репозиторий ВГУ